Прэзентацыя на тэму:



# Плюская сярэдняя шко

Падрыхтавалі: Атршкевіч Таццяна, Руткоўская Дзіяна.



# Толькі маленькія абрыў
# як іскры ў цемры…

Не пагарджаць святым мінулым,

А заслужыць і вартым быць яго!

Гісторыя Плюскай школы пачынаецца з вёскі Краснагорка. Менавіта тут у *1867* годзе адбылося адкрыццё Краснагоскага народнага вучылішча, у якім набывалі веды дзесяць навучэнцаў (юнакі) і працавалі два выкладчыкі.

Памятныя кнігі Ковенскай губерніі сведчаць аб тым, што *15* лістапада *1869* года адчыніла свае дзверы **Краснагорская другакласная царкоўна-прыходская** з настаўніцкім курсам школа,



# Толькі маленькія абрыўкі, як іскры ў цемры…

Школьны будынак уяўляў сабой два класных пакоі, інтэрнат для вучняў, кухню.

У *1898* годзе пры другакласнай царкоўна-прыходскай школе адчынілася школа граматы.

У *1900* годзе адбыўся першы выпуск вучняў Краснагорскай царкоўна-прыходскай школы. Старэйшым настаўнікам працаваў Аляксандр Сіняў, Уладзімір Качыноўскі — малодшым настаўнікам, Закон Божы выкладаў Мікалай



# Толькі маленькія абрыўкі як іскры ў цемры…

У *1904* годзе пры другакласнай царкоўна-прыходскай школе заснавана ўзорная першакласная царкоўна-прыходская школа, загадчыкам якой і выкладчыкам Закона Божага быў Наркіс Івацэвіч. Настаўнікам працаваў А.Р.Белісаў.

У *1905-1906* гг. Краснагорскае народнае вучылішча было перайменавана ў **Краснагорска - Плюскае** народнае вучылішча.

Да гэтага часу настаўнікамі працавалі Сяргей



# Толькі маленькія абрыўк як іскры ў цемры…

У *20-30* гады ў Плюсах дзейнічала **агульнаадукацыйная грамадская школа**. Школа была польскамоўная. Вывучаліся наступныя прадметы: грамадазнаўства, рэлігія, польская мова, гісторыя, геаграфія, прырода, арыфметыка і геаметрыя, маляване, заняткі практычныя (праца), спевы, практыкаванні цялесныя (фізкультура).



# Толькі маленькія абрыўк як іскры ў цемры…

*3* кастрычніка *1939* г. пачала дзейнічаць рускамоўная школа. З *1941* года беларускамоўная. Працавалі тыя ж настаўнікі. Нацэвіч у час вайны быў расстраляны немцамі.

Пасля вайны навучанне ў Плюсах прадоўжылася. Да *1953* года школа ў Плюсах заставалася *7*-гадовай. А ў *1953* г. стала **сярэдняй**, і ў *1955* годзе быў першы выпуск *10* класа.



# Толькі маленькія абрыўк як іскры ў цемры…

Дырэктарам **Плюскай СШ** у *1956* г. быў Халімоненка Мікалай Васільевіч. У далейшыя гады дырэктары часта мяняліся.Натупным быў Петрачэнка. Пасля пасаду дырэктара заняў Мішкуцёнак.

З *15* сакавіка *1957* года пасаду дырэктара займала Бубнова Марыя Мікалаеўна.



# Толькі маленькія абрыўк
# якія скрыў цемры...

З 1960 года па 1973 год дырэктарамі Плюскай СШ розную колькасць гадоў былі:

- Ткачоў Леанід Ягоравіч.
- Болдышаў  Аляксей Сямёнавіч, настаўнік фізікі.
- Сарыкаў Анатолій Ягоравіч, настаўнік гісторыі.
- Жонка Сарыкава — Фадзеева Таццяна Мікалаеўна, настаўніца біялогіі і хіміі.



# Толькі маленькія абрыўк… як іскры ў цемры…

Сарыкаў Анатолій Ягоравіч і Фадзеева Таццяна Мікалаеўна былі дырэктарамі ў той час, калі ўзводзіўся сучасны будынак школы. *1969* год стаў годам адкрыцця новай школы. У *60-70* гады ў школе актыўным было навучанне ў вячэрняй школе. У мясцовых жыхароў захаваліся пасведчанні аб *8*-гадовай адукацыі з подпісамі дырэктара Фадзеевай Таццяны Мікалаеўны, настаўніцы біялогіі і хіміі Авеічынай Лідзіі Іванаўны.



# Толькі маленькія абрыўк
# як іскры ў цемры…

На фотоздымках *70*-х гадоў пейзаж, зусім не падобны на сучасны: няма высокіх бяроз вакол школы, каля фасаду растуць тры яшчэ зусім маленькія туі.

Шмат пасадак каля школы і стадыёна зроблена ў час, калі ў *1973* годзе Плюскую школу ўзначаліў Белусь Казімір Канстанцінавіч, які і зараз жыве ў Плюсах





# Толькі маленькія абрыўк як іскры ў цемры…

Пад яго кіраўніцтвам закладзены парк Славы, устаноўлены бюст Івана Мікітавіча Валчкова, Героя Савецкага Саюза, які загінуў, абараняючы Плюсы. У той час школа змагалася за званне імя І.М.Валчкова, але гэта зрабіць было нельга паколькі стала вядома, што на радзіме героя, у Башкірыі, ёсць школа, якая носіць яго імя.





# Толькі маленькія абрыўк як іскры ў цемры…

У *1987* годзе дырэктарам школы быў назначаны Валяўка Франц Леанідавіч.

За перыяд з *1955* па *2007* год Плюскай сярэдняй школай быў зроблены *51* выпуск. Атэстат аб сярэдняй адукацыі атрымалі каля *556* чалавек.

## Наша невялічкая школа – вельмі яркая іскарка, у велізарнай сістэме адукацыі Беларусі*!*